**ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2017 г.

**<u>Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”</u>**

**8 лістапада**

Да юбілею Якуба Коласа ў бібліятэцы прайшлі літаратурныя вячоркі “Любімы пясняр беларускага народа”. Удзельнікі літаратурна-паэтычнага гуртка “Крыніца” пазнаёмілі прысутных з жыццёвым і творчым шляхам вялікага класіка, арганізавалі конкурс чытальнікаў “Родныя вобразы”, правялі віктарыну “Праз кнігу і бібліятэку да ведаў і свету”. Бібліятэкарам арганізавана кніжная выстава “Якуб Колас: вядомы і невядомы...”, выстава малюнкаў “Творы Якуба Коласа ў малюнках” і прагляд мультымедыйнай прэзентацыі “Пявучае коласаўскае дрэва”.

Батчынская ПБ, 29 чал.

**10 лістапада**

На раённым семінары "Бібліятэчнае краязнаўства - тэрыторыя вялікіх магчымасцяў" бібліятэчныя работнікі раёна даведаліся шмат карыснага і цікавага, што можна ўзяць на ўзбраенне ў рабоце бібліятэк па краязнаўству. Спецыялісты цэнтральнай бібліятэкі выступілі з кансультацыямі па тэме семінара. Вопытам працы па зборы і выкарыстоўванню краязнаўчых матэрыялаў падзяліліся з калегамі бібліятэкары сельскіх публічных бібліятэк. Увазе супрацоўнікаў прадстаўлена панарамная экспазіцыя “Краязнаўчы калейдаскоп”.

ЦРБ, 52 чал.

**13 лістапада**

З нагоды святкавання 135-годдзя з дня нараджэння беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, бібліятэкай сумесна з Домам культуры і кінавідэацэнтрам “Вясёлка” арганізавана свята для вучняў Арэхаўскай школы “Песняры зямлі беларускай”. Удзельнікі мерапрыемства слухалі выступленне літаратурна-паэтычнай групы “Ветразь”, чыталі вершы, глядзелі відэафільм “Якуб Колас. Паэт і чалавек”, адказвалі на пытанні віктарыны.

Арэхаўская ПБ, 60 чал.

**27 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “Матчына мова, родная мова”. У выкананні ўдзельнікаў Універсітэта Залатога ўзросту прагучалі музычныя нумары на словы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і іншых беларускіх паэтаў. У ходзе мерапрыемства гучалі байкі К. Крапівы. Мерапрыемства суправаджалася паказам мультымедыйнай прэзентацыі "Роднай мовы словы

непаўторныя". Вядучыя мерапрыемства - кіраўнік літаратурна-музычнай гасцінай Людміла Заяц і ўдзельнік Надзея Валеватая стварылі святочную атмасферу ў зале.

ЦРБ, 60 чал.

**27 лістапада**

Бібліятэка арганізавала фальклорную гадзіну "Спадчына роднай вёскі" ў Тэвельскім дзіцячым садзе-пачатковай школе. Вядучыя мерапрыемства пазнаемілі прысутных з гісторыяй вёскі і звычаямі яе жыхароў, правялі падарожжа па старонках беларускіх кніг і часопісаў.

Вучні чыталі вершы пра родную мову, пра Беларусь. Фальклорны гурт "Скарыначка" парадаваў прысутных песнямі, а народная майстрыха Майя Гамола расказала пра свае вышыўкі. Праведзены майстар-клас "Бабуліны танцы", які зацікавіў не толькі вучняў, але і настаўнікаў.

Тэвельская ПБ, 35 чал.

**29 лістапада**

У сярэдняй школе №6 для навучэнцаў 9-ых класаў прайшло выступленне ЛПГ “Рытм” “Мудры, зямны, незабыўны…”, прысвечанае 105-годдзю Максіма Танка. Падчас мерапрыемства супрацоўнікі бібліятэкі разам з вучнямі адгарнулі цікавыя і незабыўныя старонкі жыцця класіка, паслухалі вершы і ўрыўкі з яго паэм, узгадалі песні на словы паэта. Мерапрыемства суправаджалася паказам мультымедыйнай прэзентацыі “Гартаючы жыцця яго старонкі”.

ЦРБ, 34 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках абласной прафілактычнай акцыі “Карысныя канікулы”

**8 лістапада**

Для юных карыстальнікаў бібліятэкі праведзены шэраг мерапрыемстваў. Гадзіна разважанняў “У кніжнай памяці імгненні вайны” пазнаёміла дзяцей з малавядомымі фактамі трагічных падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці атрымалі магчымасць выявіць сваю эрудыцыю ў конкурсе знаўцаў літаратуры «Даведайся. Прачытай. Раскажы». Фальклорная гадзіна «Прыказкі і прымаўкі - увасабленне народнай мудрасці» дазволіў дзецям даведацца і запомніць шмат новых прымавак і прыказак.

Гарадзецкі філіял, 42 чал.

**8 лістапада**

Чарговую “Вечернюю сказку в библиотеке” правялі для сваіх маленькіх наведвальнікаў бібліятэкары. Кнігу Валянціны Асеевай “Волшебное слово” па ролях чыталі бацькі, якія прыйшлі ў бібліятэку разам з дзецьмі. Пры абмеркаванні прачытанага дзеці вырашылі дапамагчы галоўнаму герою ў пошуку “чароўных” слоў. Яны адправіліся на пошукі чароўнага куфэрка, куды потым склалі самаробныя сэрцайкі з чароўнымі словамі. Па казачнай пошце, якая ёсць толькі ў бібліятэцы, куфэрак адправіўся да героя кнігі.

Дзівінскі філіял, 18 чал.

**9 лістапада**

«У бібліятэку прыходзь – выдатна час праводзь!» - пад такім дэвізам праходзілі восеньскія канікулы ў бібліятэцы. Дзеці маглі не толькі ўзяць чытаць любыя кнігі, але і заняцца творчасцю, паўдзельнічаць у літаратурных гульнях. Юныя пераможцы конкурсу «Мае ілюстрацыі да любімай кнігі» атрымалі права папрацаваць на канікулах дублёрам бібліятэкара. Удзельнікі літаратурнай гульні «Хачу ўсё ведаць» шукалі адказы на разнастаныя заданні на кніжных паліцах, а ў часопісах - новыя ідэі да Новага года.

Залеская ПБ, 26 чал.

**9 лістапада**

Для юных наведвальнікаў бібліятэкі прайшла зорная гадзіна «У краіне дарожных знакаў». Дзеці слухалі расказ бібліятэкара па правілах бяспекі паводзін на дарозе, дружна адказвалі на пытанні віктарын і загадак па правілах дарожнага руху, ўдзельнічалі ў рухомых гульнях, глядзелі відэапрэзентацыю «У краіне дарожных знакаў». Пераможцы атрымалі квіткі на права бясплатнага карыстання дадатковымі паслугамі бібліятэкі.

Павіццеўская ПБ, 28 чал.

**<u>Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Всемирный день некурения»</u>**

**15 лістапада**

Бібліятэкарам арганізавана інфармацыйная гадзіна “Курить не модно, дыши свободно” для навучэнцаў сярэдніх классаў. У сваім выступленні фельчар Кальман Неллі Міхайлаўна расказала прысутным аб тым, які доўгі перыяд патрабуецца чалавеку для ачышчэння арганізма ад нікаціну і іншых шкодных рэчываў, згадала аб актуальнасці праблемы тытунекурэння. Затым дзеці адправіліся ў гульнявое падарожжа па дарогах здароўя. З вялікай цікавасцю яны ўдзельнічалі ў рухомых гульнях, конкурсах і інтэлектуальных віктарынах.

Павіццеўская ПБ, 19 чал.

**17 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшло пасяджэнне клуба «Час і ты» - урок-перасцярога «Ценность моей жизни». Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Супрацоўнікі бібліятэкі прывялі статыстыку смяротнасці ад суіцыду і расказалі, чым могуць дапамагчы людзі, якія знаходзяцца побач, у прадухіленні падобнай сітуацыі. Святар Аляксандр правёў размову пра сэнс чалавечага жыцця, аб маральных каштоўнасцях, аб стаўленні царквы да суіцыду. Урач-валеолаг Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы Васільева С.С. расказала пра згубны ўплыў шкодных звычак, якія могуць стаць нагодай да праявы суіцыдальных паводзін.

ЦРБ, 48 чал.

**26 лістапада**

Дзень здароў'я ў бібліятэцы " О здоровье от "А" до "Я" ўключаў сустрэчу чытачоў з доктарам Скібук Н.І., якая паведаміла, як шкодныя звычкі ўплываюць на здароў'е чалавека. Наведвальнікі пазнаёміліся з аглядам медыцынскай літаратуры з фонду бібліятэкі. Кожны жадаючы мог прайсці камп'ютарную дыагностыку на апараце "Рофэс".

Дзівінскі філіял, 53 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**17 лістапада**

У Кобрынскім дзяржаўным прафесійным ліцэі сферы абслугоўвання прайшла інфармацыйная гадзіна «Молодёжные субкультуры: "за" и "против"», прымеркаваная Міжнароднаму дню студэнтаў. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі пра розныя бакі ўплыву субкультур для грамадства і для самой моладзі ў прыватнасці, пра найбольш папулярныя маладзежныя субкультуры, падмацоўваючы свае выступленні відэаматэрыяламі.

ЦРБ, 32 чал.

**28 лістапада**

У Кобрынскім дзяржаўным палітэхнічным каледжы прайшло пасяджэнне клуба «Час і ты» - гадзіна шчырай размовы "СНІД не выбірае. Выбіраеш ты". Навучэнцы пазнаёміліся з гісторыяй захворвання, з Міжнародным сімвалам барацьбы са СНІДам - Чырвонай стужкай. Урач-валеолаг Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы Васільева С.С. расказала пра спосабы перадачы віруса і правілах абароны, аб абследаванні на ВІЧ, пра бяспечныя паводзіны і аб магчымасцях прадухілення інфіцірывання. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй з відэафрагментамі.

ЦРБ, 32 чал.

**29 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылася чарговая інтэлектуальная гульня "Кобрынскія гульні эрудытаў", якая сабрала 14 каманд настаўнікаў школ горада і раёна. Паўтары гадзіны ўдзельнікі адказвалі на разнастайныя пытанні і змагаліся за перамогу. Лепшымі сталі каманды гімназіі, школы №8 і школы №4 горада Кобрына, якія атрымалі прызы ад спонсараў інтэлектуальнага аборніцтва.

ЦРБ, 82 чал.

Выканаўца
Т. А. Галавейка
8 016 42 2 36 81